**Слівіна Вікторыя, 12 група**

# КАХАННЕ НА АДЛЕГЛАСЦІ

Я доўга думала, на якую ж тэму будзе маё эсэ. Я лічу, што трэба пісаць пра рэчы, якія адбываюцца ці адбываліся з табой. “Каханне на адлегласці” – вось тэма, якая вельмі блізкая мне.

Шмат хто сцвярджае, што не бывае сапраўднага кахання ў падлеткавым узросце. Мабыць, я не пагаджуся з імі. Я лічу, што каханне падлеткаў самае шчырае і сапраўднае. Мне сямнаццаць гадоў, і я не саромеюся прызнацца, што я кахаю па-сапраўднаму. Гэта ж выдатна, калі ў цябе, апроч бацькоў, ёсць блізкі чалавек, які заўсёды цябе падтрымае, дапаможа ў любой сітуацыі і проста будзе побач. І не мае ніякага значэння, колькі закаханым гадоў.

Мой малады чалавек побач са мной ужо тры гады. Цягам гэтых гадоў мы перажылі адны з самых важных этапаў у нашым жыцці: заканчэнне школы і паступленне. З’явілася вельмі вялікая, як я думала на той момант, праблема, якая стала прычынай расставання многіх пар. Нас падзяліла адлегласць. Здаецца, гэта самае жудаснае, што можа быць, і спачатку нам было вельмі цяжка. Я перачытала вялікую колькасць артыкулаў, у якіх сцвярджалася думка пра немагчымасць кахання на адлегласці. Амаль усе аўтары прыходзілі да адзінага меркавання: у такога кахання няма будучыні. І я задумалася. Аднак мой каханы пераканаў мяне сваёй упэўненасцю: “Якая розніца, што пішуць у гэтых артыкулах. Галоўнае – давер і тое, што ты адчуваеш. І калі ты гатовая давяраць мне, то наша каханне куды мацней за адлегласць”.

Цяпер я перастала сумнявацца і з упэўненасцю магу сказаць, што каханне на адлегласці існуе, варта толькі кахаць чалавека, якому давяраеш.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ